чаёў» (1969), «Знаёмыя сілуэты» (1974), «Людзі і маскі» (1927).

Г. СЕРАБРАКОЎ

80 гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МАРТЫНАВІЧА ХАДЫКІ**, беларускага савецкага паэта.

У адным з вершаў Уладзімір Хадыка напісаў: «З сваіх сяброў я самы сціплы лірык». У гісторыі беларускай літаратуры ён застанецца перш за ўсё як адзін з выдатных прадстаўнікоў беларускай лірычнай паэзіі 20—30-х гадоў.

Біяграфія У. Хадыкі — тыповая біяграфія паэта-маладнякоўца. Нарадзіўся ён 21 снежня 1904 (па новым стылі 3 студзеня 1905) года ў вёсцы Цітва Ігуменскага павета Мінскай губерні ў беднай сялянскай сям'і. З дзіцячых гадоў парабкаваў. Радасна сустрэў Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю. Перажыў белапольскую акупацыю, прымаў удзел у барацьбе супроць акупантаў і белагвардзейцаў. У савецкі час вучыўся на агульнаадукацыйных курсах у Мінску, служыў у Чырвонай Арміі, працаваў сакратаром сельсавета. У 1925 годзе ўдзельнічаў у з'ездзе «Маладняка». З 1929 года жыў у Мінску. Некаторы час працаваў сакратаром у часопісе «Полымя». Выдаў тры кнігі паэзіі — «Суніцы» (1926), «Выбраныя вершы» (1932), «Радасны будзень» (1935).

Вершы, што склалі першы зборнік «Суніцы», былі выразна маладнякоўскімі, гучалі радасна і бадзёра. Яны прасякнуты моцнай любоўю да роднай зямлі, да яе прыроды. Напрыклад, у вершы «Беларусь», зачараваны красой беларускага пейзажа, малады паэт не можа паверыць «у моц гаманы, што пякней Беларусі Швейцарыя!..». Як і многія яго літаратурныя паплечнікі, У. Хадыка звяртаўся да падзей грамадзянскай вайны, закранаў надзённую і асабліва актуальную ў той час антырэлігійную тэму. Ужо на самым пачатку яго лірыка вызначалася дасканалай рытмічнай арганізаванасцю, страфічнай разнастайнасцю і вобразным багаццем. У. Хадыка не выяўляў асаблівай прыхільнасці да сюжэтнага, апавядальнага верша. У яго ранняй лірыцы раскрываліся ў арыгінальнай, хоць іншы раз і дэкларацыйнай ці рытарычнай форме, галоўным чынам эмоцыя, пачуццё. Паэт быў чуйны да народнай мовы.

Адзначым, што У. Хадыка адзін з першых у беларускай паэзіі пачаў вызваляцца ў другой палове 20-х гадоў ад бурапеннасці, віхрыстасці. Паэта не мог ужо задаволіць ранейшы «юнацкі наш галоп» (верш «Хлопцы, дуй!»). Ён шукаў новыя сродкі для раскрыцця ўласных думак і перажыванняў, для эстэтычнага асваення сацыялістычнай рэчаіснасці.

Аб якасных зменах у паэзіі У. Хадыкі сведчаць такія яго лепшыя творы, напісаныя ў 1927—1928 гады, як «Штандар чырвоны, штандар чырвоны», «Вецер лётае, вецер гойсае», «Снапок аўса», «Гарманіст».

У. Хадыка напружана і пакутліва шукаў адказы на многія пытанні. Як і ў кожнага таленавітага і сумленнага паэта, шлях да ісціны быў складаны і няпросты. Аднак заўсёды ён быў шчырым у выяўленні сваіх думак і пачуццяў, у адносінах да жыцця.

Творчы шлях У. Хадыкі, які працягваўся ўсяго дзесяць гадоў, сёння ў цэлым нам уяўляецца ўзыходзячай прамой. Наперакор патрабаванням вульгарнасацыялагічнай крытыкі, якая заахвочвала эмацыянальную аднабаковасць, паэт ніколі не выказваў у сваіх творах прыхільнасці да пафаснай публіцыстыкі. Ён не столькі дэкларыраваў у форме трыбунных лозунгаў і заклікаў сваю сувязь з гераічным часам, колькі імкнуўся глыбей пранікнуць у грамадскія працэсы і душу чалавека.

Акрамя таго, У. Хадыка напружана шукаў уласны паэтычны стыль на скрыжаванні розных паэтычных традыцый (С. Ясенін, А. Блок, М. Асееў, Б. Пастарнак). Праўда, пошукі гэтыя не заўсёды давалі жаданы плён.

Лірык па таленту паэтычнага светаадчування, У. Хадыка з асаблівай сілай раскрыўся ў «Песнях з поўдня». Гэты твор вызначаецца смеласцю паэтычнай вобразнасці і рытміка-інтанацыйным багаццем. Гучыць ён лёгка, свабодна і натуральна. У ім выразна раскрылася арганічнае адзінства грамадскіх матываў і інтымных перажыванняў.

Хадыка вядомы таксама як перакладчык. У яго перакладах загучалі на беларускай мове такія творы, як «Песня пра Буравесніка», «Мяшчане», «На дне», «Чалавек», «Дачнікі», «Дзеці сонца», «Варвары» Максіма Горкага, раман К. Гарбунова «Ледалом» (1932), кніга выбраных твораў У. Бахмецьева «Людзі і рэчы» (1934), раман М. Шолахава «Ціхі Дон» (1936).

А. ВЕРАБЕЙ